# На тым тыдні...

✓**6 чэрвеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбылася **прэзентацыя Рэспубліканскай выстаўкі мастацкіх твораў навучэнцаў дзіцячых школаў мастацтваў, прысвечанай Году малой радзімы**, і ўзнагароджанне ўдзельнікаў. Прадстаўленыя працы вучняў з розных куткоў краіны.

✓**8 чэрвеня** ў мястэчку Любча на Навагрудчыне адбылося **свята сыру «Вясёлы сыравар»**. У праграме былі кулінарнае шоу «Усе смакі свету – у кавалачку сыру», конкурс «Сырнае дасягненне», выстаўка-продаж разнастайных гатункаў сыру і іншых малочных прадуктаў, выступленне калектываў народнай творчасці. ААТ «Малочная кампанія "Навагрудскія Дары"» прадставіла прадукцыю ўласнай вытворчасці. Мясцовыя кулінары-аматары прынеслі на свята сыры хатняга прыгатавання.

✓Здаўна Вярэйкі Ваўкавыскага раёна славяцца маляўнічай прыродай і рыбнымі месцамі. **9 чэрвеня** тут на беразе возера правялі **свята «Zалатая рыбка»**. У праграме былі тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам Залатой рыбкі, прамудрага Пескара, Кашы-прынады. Рыбацкія каманды Ваўкавыскага раёна бралі ўдзел у спаборніцтвах па колькасці злоўленай рыбы, прайшлі конкурсы «Клёвае месца», «Рыбацкая байка», «Вось дык рыбіна!», была і дэгустацыя страваў з рыбы.

**11 чэрвеня** Пасольства Венгрыі ў Рэспубліцы Беларусь перадало ў **дарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі** серыю манаграфіяў «Комитаты и города Венгрии». Выданне прыдасца для даследчыкаў венгерскай мовы, гісторыі, геаграфіі, дзяржаўнага кіравання і транспарту гэтай краіны.

✓**11 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **літаратурна-музычная імпрэза «Адчуванне радзімы: беларуская элегія» народнага калектыву аўтарскай песні «Элегія»** (г. Вілейка).



Калектыў «Элегія» шырока вядомы ў Беларусі і за яе межамі. Яго ўдзельнікі – лаўрэаты і дыпламанты рэспубліканскіх, абласных і міжнародных фестываляў. Сёння «Элегія» мае ў сваім рэпертуары звыш 90 уласных і напісаных на вершы беларускіх паэтаў песень. Разам з песнямі гучала інструментальная музыка ў выкананні Таццяны Захарыч (гітара, раяль), Уладзіміра Лапціка (гітара), Вікторыі Амельяновіч (скрыпка), маладых выканаўцаў. Госці вечарыны таксама наведалі выстаўку «Свет летуценняў», арганізаваную Вілейскім Цэнтрам эстэтычнага выхавання, на якой былі прадстаўленыя працы ў тэхніцы выцінанкі і бісерапляцення, саматканыя паясы, лялькі, выробленыя рукамі народных мастакоў Вілейшчыны.

✓**З 14 чэрвеня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь працуе **выстаўка «Казимир Малевич и XXI век»**, што арганізаваная ў рамках Культурнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў 2019 г. Упершыню дэманструецца карціна меркаванага аўтарства К. Малевіча ў экспазіцыі працаў айчынных мастакоў, якія развіваюць традыцыі Малевіча. Творы прадстаўленыя ў сінтэзе з этнаграфіяй з Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Выстаўка будзе доўжыцца да 1 верасня.

✓**14 чэрвеня** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося **адкрыццё выстаўкі «Маляваныя сны»** Ірыны Церашковай і Жанны Ільюшкінай. Прадстаўленыя працы з таямнічага свету наіўнага мастацтва – маляванкі. Яна стала адной з першых у нашай краіне з'яваў масавай культуры і адным з ранніх інстынктыўных прыкладаў мастацкай практыкі. Сюжэты навеяныя беларускаю міфалогіяй і народнымі легендамі, а таксама экспедыцыямі па родным краі. Працы створаныя цягам некалькіх апошніх гадоў. Пабачыць іх можна па 30 чэрвеня.

✓У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь **14 чэрвеня** адкрылася **выстаўка «Беларусь на старажытных геаграфічных картах»**. Арганізатары прапануюць паглядзець на карты ВКЛ, Рэчы Паспалітай ды іншых краінаў свету, дзе па-рознаму выяўленыя і нашыя землі. Усяго прадстаўлена больш за 30 копіяў картаў. Яны выкананыя на акварэльнай паперы з выкарыстаннем лічбавых тэхналогіяў, што дазваляе дакладна ўзнавіць аўтэнтычнасць старадаўніх картаў і зрабіць іх амаль не адрознымі ад арыгіналу. Арганізатары выстаўкі – Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, таварыства «Беларуская філасофская прастора», Лятучы ўніверсітэт, выдавецкі цэнтр «Экономпресс». Пабачыць выстаўку можна да 9 ліпеня.

✓**Свята з водарам клубніцаў** прайшло **15 чэрвеня** ў Бародзічах Зэльвенскага раёна. Тут гэтую ягаду вырошчвае практычна кожны. Жыхароў і гасцей на свяце чакалі вясёлыя прыгоды ў «клубнічным царстве». Каралева Клубніца сустрэла гасцей песнямі, пачаставала напоямі і клубніцамі розных відаў і гатункаў, выпечкай з клубнічнай начынкай. А дасведчаныя гаспадыні правялі майстар-класы па прыгатаванні клубнічнага фандзю і сочыва. А модніцам быў прапанаваны... «клубнічны» манікюр.

✓ У мястэчку Ліпнішкі (Іўеўскі раён) **15 чэрвеня** зладзілі **свята «Ліпнішкаўскія сенакосы»**. Запрашалі ўсіх, хто хацеў паспрабаваць сілы ў конкурсе ручной касьбы. Пад час свята прайшлі майстар-класы па кляпанні касы, пляценні вянкоў, вырабе лялечкі «Траўніца». Працавалі падворкі «Сялянская трапеза». Пад час свята абралі дзяўчыну з самай доўгай касою.

